Падрыхтаваны васямнаццаты выпуск каталога «Інфармацыйныя рэсурсы і сістэмы Беларусі»

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляе васямнаццаты выпуск каталога «Інфармацыйныя рэсурсы і сістэмы Беларусі», які змяшчае звесткі аб інфармацыйных рэсурсахі сістэмах, якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю і ўключаны ў дзяржаўныя рэгістры інфармацыйных рэсурсаў і сістэм.

Каталог «Інфармацыйныя рэсурсы і сісітэмы Беларусі» з 2002 года штогод выдаецца ў мэтах інфармавання аб складзе і змесце інфармацыйных рэсурсаў і сістэм у Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 455-З «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі».

Васямнаццаты выпуск каталога 2019 года папоўніўся 3 644 рэсурсамі і 25 інфармацыйнымі сістэмамі. Усяго па выніках года дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў налічваў звесткі аб 20 703 інфармацыйных рэсурсаў; дзяржаўны рэгістр інфармацыйных сістэм - звесткі аб 318 інфармацыйных рэсурсах.

Гэтыя інфармацыйныя рэсурсы і сістэмы распрацаваны ў выніку дзейнасці як дзяржаўных органаў, так і прадпрыемстваў розных форм уласнасці, навуковых, навучальных і грамадскіх арганізацый. Іх стварэнне і арганізацыя выкарыстання - важныя задачы, рашэнне якіх з’яўляецца першарадным пры фарміраванні неабходнай інфармацыйнаі прасторы для развіцця інфармацыйнага грамадства.

Рэгістры актуалізуюцца штомесячна. Доступ да актальных звестак, змешчаных у іх, прадастаўлены ў сетцы Інтэрнэт па адрасе: грис.бел, а Таксама ў бліжэйшы час будзе забяспечаны з дапамогай адзінага партала электронных паслуг.

Звяртаем увагу, што з 2020 года ажыццяўленне адміністратыўнай працэдуры «Дзяржаўная рэгістрацыя інфармацыйных сістэм» можа выконвацца ў электроннай форме на адзіным партале электронных паслуг. З 2021 года у такім фармаце будзе таксама ажыццяўляцца адміністратыўная працэдура «Дзяржаўная рэгістрацыя інфармацыйных рэсурсаў».

Спасылка на каталог

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/15-06-2020-6480*